20 год Гродзенскай дыяцэзіі (11)

Аўтар: Рэдакцыя
25.06.2011 03:00



2000 год

23 – 25 чэрвеня - І Дыяцэзіяльны Эўхарыстычны кангрэс у Гродне.

24 чэрвеня - У Смаргоні ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч удзяліў сакрамант святарства дыякану Аляксандру Яшэўскаму з супольнасці ксяндзоў салезіянаў.

26 – 28 - чэрвеня І Фестываль рэлігійнай песні ў Гродне “Te Deum Laudamus”.

† 15 ліпеня - Асвячэнне касцёла Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў Наваельні.

23 ліпеня - Асвячэнне касцёла Маці Божай Тройчы Цудоўнай у Мастах.

1 жніўня - Падзяка Богу за беатыфікацыю 11 сёстраў назарэтанак мучаніц у Навагрудку.

7 – 21 жніўня - Моладзь нашай дыяцэзіі (каля 280 чалавек) прыняла ўдзел у XV Сусветных днях моладзі ў Рыме.

19 жніўня - У Пабрыгіцкім касцёле 5 сёстраў назарэтанак склалі вечныя шлюбы. Урачыстасць узначаліў пастыр дыяцэзіі.

20 жніўня - Асвячэнне пляцоўкі пад будаўніцтва касцёла ў Путрышках. Асвяціў яго ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч.

25 – 26 жніўня - Юбілейныя Дні моладзі ў Гродне.

3 верасня - Ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч асвяціў пляцоўку пад будаўніцтва касцёла Унебаўзяцця НПМ і св. Юзафа Каласанса ў Лідзе ў м-не Індустрыяльны.